■ АХОВА ПРЫРОДЫ

# Дровы аказаліся “залатымі”

***Каб спілаваць дрэва на прыватным участку, дазвол не патрэбны, але для высечкі дрэў на землях агульнага выкарыстання неабходна атрымаць яго ў сельскім Савеце або лясгасе. Нават тады, калі дрэва знаходзіцца ў аварыйным стане.***

Гэтыя простыя правілы не засвоіла жыхарка Магілёва С. Яна вырашыла нарыхтаваць дровы для сваёй маці, якая жыве ў аг. Свяцілавічы. Жанчына спілавала за межамі ўчастка маці дванаццаць дрэў вярбы казінай, чым парушыла ч. 3 арт. 15.22 КоАП РБ, за што атрымала адміністрацыйны штраф у памеры 5 б. в. Таксама яна павінна кампенсаваць шкоду, нанесеную навакольнаму асяроддзю. Сума налічваецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб парадку вылічэння памеру пакрыцця шкоды, прычыненай навакольнаму асяроддзю, і Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 24 чэрвеня 2008 г. № 348 “Аб таксах для вызначэння памеру кампенсацыі шкоды, нанесенай навакольнаму асяроддзю”. Грашовы памер кампенсацыі склаў 1470 рублёў.



**Незаконна нарыхтаваныя дровы вельмі дорага абышліся.**

*Калі вам сталі вядомыя выпадкі незаконнай высечкі дрэў, тэлефануйце ў раённую інспекцыю прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па нумары **78-702**.*

**Юрый СІМАНАЎ,**
**начальнік**
**райінспекцыі ПРіАНА.**

■ КРЫМІНАЛ

# Дзяўчына. Аўтамабіль. Алкаголь

***Людзям, якія знаходзяцца пад уплывам алкагольнага дурману, нескладана парушыць грамадскі парадак. Спіртное выдатна развязвае не толькі язык, але і рукі. Горш, калі ў п’яным хуліганстве ключавую ролю адыгрываюць прадстаўніцы прыгожага полу.***

Бялынічанка Л. разам з сяброўкай адзначалі ў адным з кафэ райцэнтра зусім нежаночае свята – Дзень абаронцаў Айчыны. Дзяўчыны моцна выпілі. У нейкі момант ім не спадабаліся суседкі з бліжэйшага століка, і яны паспрабавалі ўстанавіць справядлівасць пры дапамозе кулакоў. Бойку разнялі, дзяўчат адправілі па дамах, але Л. усё ніяк не магла супакоіцца. Яна дайшла да свайго пад’езда і нечакана высветліла, што ключы ад уваходных дзвярэй недзе згубіла. Раззлаваная, яна вырашыла вымесціць сваю злосць на аўтамабілі, які стаяў побач з домам. Выпітае спіртное дадало ёй рашучасці, і Л. пачала малаціць па машыне рукамі і нагамі. У выніку, яна прычыніла ўладальніку аўто матэрыяльны ўрон больш як на 400 рублёў.

Сваімі дзеяннямі Л. зрабіла злачынства, прадугледжанае ч. 1 арт. 339 Крымінальнага кодэкса Беларусі (хуліганства). А раённы суд прызначыў ёй пакаранне ў выглядзе штрафу.

**Алена МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**следчы РАСК.**

# Бясплатна – толькі сыр у пастцы...

***Да пакарання ў выглядзе 6 месяцаў пазбаўлення волі з выпрабавальным тэрмінам на 1 год асуджана грамадзянка Н. за прысваенне дзяржаўнай маёмасці.***

Пасля інвентарызацыі ў магазіне “Прадукты” райста, што па вуліцы Гагарына, 25, была выяўлена недастача ў суме 6885 рублёў. Аказалася, што прадавец гэтага магазіна Н. дазваляла пакупнікам браць тавары ў доўг на працягу сваёй працы ў ім з 23 мая па 27 верасня мінулага года. Спіс даўжнікоў яна вяла сама, пазначаючы ў спецыяльна заведзеным сшытку толькі іх прозвішчы без адраса пражывання. Пры далейшым разбіральніцтве высветлілася, што Н. праз адмену касавых чэкаў, калі пакупнікі разлічваліся за свае даўгі, прысвоіла 1044 рублі. Сваю віну яна прызнала цалкам, акрамя таго, віноватасць пацвярджаецца паказаннямі шматлікіх сведкаў. Муж Н. распавёў, што яму вядома пра прысваенне жонкай грошай і матэрыяльных каштоўнасцей, у асноўным, прадуктаў харчавання. Грамадзянка Н. парушыла ч. 1 арт 211 КК РБ. Змякчальнымі абставінамі пры вынясенні прыгавора з’явілася яе чыстасардэчнае раскаянне ў злачынстве і наяўнасць у сям’і траіх непаўналетніх дзяцей. У кошт пагашэння недастачы грамадзянка Н. унесла 2656 рублёў, яшчэ 500 рублёў за яе вярнула свякроў.

**Таццяна КОЗЫРАВА,**
**старшы следчы РАСК.**

■ СЛЕДСТВЕННЫЙ КОМИТЕТ

# Взял... на свою голову

***В конце декабря прошлого года в нашем городе появился новый торговый объект, открытие которого давно с нетерпением ждали жители города и района. Однако мало кому известно, что оно могло и не состояться.***

Дело в том, что в период строительства торгового объекта белыничанин Р. предложил руководителю работ свои услуги в качестве подсобного рабочего. На тот момент Р. был безработным, четырежды судимым за совершение краж, а также состоял на учете у врача-нарколога с диагнозом: «хронический алкоголизм».

Стоит отметить, что руководитель строительных работ и Р. познакомились при необычных обстоятельствах. В один из декабрьских дней строитель обратил внимание на мужчину, который находился в состоянии сильного алкогольного опьянения и не мог самостоятельно передвигаться. Поскольку время было позднее, а на улице стояла минусовая температура, он стал просить случайных прохожих помочь ему отвести мужчину домой. Но все проходили мимо. Р. был единственным, кто согласился. После этого они обменялись телефонами.

Чуть позже Р. ему позвонил и попросил принять на работу. Под впечатлением их первой встречи собеседник сразу же согласился, но вскоре об этом пожалел.

Как только Р. приступил к работе, сразу же обратил внимание на то, что инструменты часто оставались без присмотра, чем он, естественно, и решил воспользоваться.

Так, в один из дней он тайно похитил перфоратор, в другой – электродрель. Все это благополучно продал, а вырученные деньги потратил на приобретение алкогольных напитков.

Рабочие немедленно обратились в милицию, поскольку объект необходимо было сдать до Нового года, а инструментов не было. Вскоре, благодаря грамотным действиям сотрудников милиции, личность подозреваемого была установлена, похищенные инструменты возвращены владельцам, а торговый объект сдан вовремя.

Уголовное дело уже рассмотрено судом района. Гражданину назначено наказание в виде двух лет лишения свободы.

**Елена МЕДВЕДЕВА,**
**следователь РОСК.**

■ РАУС ІНФАРМУЕ

# Віно вінавата...

***Напачатку красавіка падчас правядзення рэйдавых мерапрыемстваў супрацоўнікі ААПП РАУС наведалі МТФ ААТ “Бялыніцкае райаграпрамтэхзабеспячэнне” ў аг. Свяцілавічы.***

Падчас гутаркі з працаўнікамі высветлілася, што загадчыца фермы і адзін з жывёлаводаў знаходзяцца ў стане алкагольнага ап’янення. Мужчына паведаміў, што выпіў, а пасля таго, як выканаў працоўныя абавязкі, “прыгаварыў” яшчэ дзве бутэлькі віна. Загадчыца фермы не патлумачыла прававахоўнікам, чаму сама знаходзілася на рабочым месцы нецвярозая і дапусціла да работы чалавека ў стане алкагольнага ап’янення.

У адносінах да гэтых грамадзян распачаты адміністрацыйны працэс па ч.2 арт. 17.3 КаАП Рэспублікі Беларусь.

**Сяргей НІЗАЎЦОЎ,**
**начальнік ААПП РАУС.**

■ ПРАФІЛАКТЫКА

# Небяспечныя знаходкі

***Знешне падобныя на боепрыпасы прадметы небяспечныя тым, што падвергнутыя карозіі баявыя часткі ўзрывальнікаў могуць справакаваць выбух у любы момант.***

Вызначыць ступень небяспекі такіх боепрыпасаў складана нават спецыялістам. Фактарам, які можа справакаваць дэтанацыю боепрыпаса, можа стаць любое ўздзеянне на яго, уключаючы прамыя сонечныя прамяні і нязначную вібрацыю прадмета, выкліканую яго перамяшчэннем. Часта падобныя знаходкі выяўляюцца вясной падчас палявых работ на ўчастках, агародах і ў лясах.

У мінулым годзе ў ваенны камісарыят Бялыніцкага і Круглянскага раёнаў паступілі 8 заявак аб выяўленні выбухованебяспечных прадметаў часоў Вялікай Айчыннай вайны, якія сумесна з вайскоўцамі 72471 і 6713 воінскіх часцей былі абясшкоджаны.

Ахвярамі няшчасных выпадкаў, звязаных з дэтанацыяй боепрыпасаў, нярэдка становяцца дзеці і падлеткі. Таму пераканаўча просім бацькоў і настаўнікаў пастаянна праводзіць тлумачальныя гутаркі з дзецьмі, вучнямі. Выбухованебяспечныя прадметы не цацкі, і зыход можа быць трагічным. Лепш быць залішне пільнымі і лішні раз перастрахавацца, паведаміўшы ў адпаведныя органы аб магчымай небяспецы, чым шкадаваць, калі здарыцца непапраўнае.

Не спрабуйце самастойна даследаваць і абясшкоджваць выяўленыя боепрыпасы! Гэта захавае не толькі ваша жыццё, але і жыццё людзей побач.

**Катэгарычна забараняецца:**

- абследаваць незнаёмы прадмет самастойна або перамяшчаць яго;
- разбіраць або распілоўваць яго;
- наносіць па прадмеце ўдары;
- накрываць, засыпаць ці закопваць знаходку;
- пры выяўленні хаця б аднаго падазронага прадмета шукаць падобныя.

**Пры выяўленні выбуханебяспечнага або знешне падобнага да яго прадмета:**

- неадкладна паведаміце аб знаходцы ў ваенны камісарыят Бялыніцкага і Круглянскага раёнаў па тэлефоне **51-387**, а таксама ў міліцыю па тэлефонах **102**, **71-220**;
- запомніце месцазнаходжанне прадмета, устанавіце папераджальныя знакі, выкарыстоўваючы падручныя матэрыялы, – жэрдкі, калы, вяроўкі, кавалкі матэрыі, камяні і г. д.;
- па магчымасці арганізуйце ахову дадзенага месца на бяспечнай адлегласці, нікога не падпускайце да прадмета да прыбыцця супрацоўнікаў міліцыі.

**Максім ЗАЙЦАЎ,**
**начальнік групы тэрытарыяльнай абароны ваеннага камісарыята Бялыніцкага і Круглянскага раёнаў.**